## ПАЎСЮДНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ЖЫЦЦЯ.

## У НЯДЗЕЛЮ БОЖАЙ МІЛАСЭРНАСЦІ - МЕКСІКА 2016

**З Санктуарыя Божай Міласэрнасці ў Тенанго-дэль-Айрэ ў Мексіцы ў нядзелю Божай Міласэрнасці, у Юбілейны Год міласэрнасці і Дзень святасці жыцця, злучаны з урачыстасцю Звеставання.**

**Мы, абаронцы жыцця, аб’яднаныя ў Міжнароднай кааліцыі «Ад акіяна да акіяна», якая вядзе гістарычнае паломніцтва Маці Божай Чанстахоўскай праз свет ў абарону жыцця,**

**Слухаючы** вялікі заклік Марыі, Маці Хрыста, каб абараніць цывілізацыю жыцця і любові ў сучасным свеце;

**Стоячы** ў прысутнасці Божай Маці перад яе жывым вобразам у Гвадэлупе на гары Тэпеяк ў Мексіцы, а таксама перад пілігрымуючай праз свет іконай Чэнстахоўскай, якую суправаджае абраз Езуса Міласэрнага;

**Спадзяючыся**, што як Марыя, вялікая заступніца абароны жыцця, аб’явілася ў Мексіцы, каб вырваць загубленых людзей ад кайданоў цывілізацыі смерці, так і сёння Яна абароніць цывілізацыю жыцця і любові, якая знаходзіцца пад пагрозай;

**Дзякуючы** за прысутнасць Марыі, якая ў іконе Чэнстахоўскай правандравала ўжо 165 000 км праз 27 краін і тры кантыненты, прабуджаючы сумленне людзей і паказваючы адзіны спосаб для выратавання сучаснага свету;

**Мы заклікаем усіх людзей добрай волі, каб услухаліся ў заклік Божай Маці і з вялікай любоўю і адданасцю ўключыліся ў абарону цывілізацыі жыцця і любові, якая сёння знаходзіцца пад вялікай пагрозай ва ўсім свеце.**

**З табой, Марыя, мы абаронім нашыя сем’і, нашых дзяцей і нашу веру, Касцёл Хрыстовы, супакой ва ўсім свеце і нашу будучыню!**

**Найсвяцейшая Маці, Марыя!**

Дзякуем Табе за вялікую пілігрымку ў Іконе Чэнстахоўскай праз свет ў абарону цывілізацыі жыцця і любові. З 2012 года Ты правандравала ўжо 165 000 км праз 27 краін на трох кантынентах, нібыта чатыры разы навокал свету. Ты шчодра раздаеш ласкі і жыватворчую любоў. Ты паказваеш свету, што вера ў сэрцах людзей усё яшчэ жывая!

Сёння Мексіка перажывае Таямніцу Твайго Наведання. Мы прыносім Цябе да нашых дамоў, сем'яў і санктуарыяў, а Ты робіш нас сапраўднымі абаронцамі жыцця. Не бойцеся! – заклікаў св. Ян Павел II – Duc in Altum! «Адплыві на глыбіню!»

Плыць праз штармавыя воды і бурныя патокі цяжка. Мы ўдзячныя, што Ты, наша Маці, Марыя, заўсёды стаіш побач з намі. Ты для нас прамяністая Ранішняя Зорка і пэўны Правадыр.

**На гары Тэпеяк ў Гвадэлупе Ты сказала святому Хуану Дыега: Не бойся (...) Ці ж тут не Я, твая Маці? Ці ж ты не знаходзішся пад Маім покрывам? Ці ж не я крыніца тваёй радасці? (...)**

Мы таксама маем запэўненне Твайго Сына: Я з вамі ва ўсе дні аж да сканчэння веку (Мц 28,20).

Нягледзячы на вялікую трывогу, боль і гора навокал нас, Ты вучыш нас жыць у любячых сем'ях, на ўзор Святой Сям'і з Назарэта. Умацуй нашу веру, давер і паяднанне са сваім Боскім Сынам, чыя міласэрнасць усім нам так патрэбна.

Маці Міласэрнасці, дадай нам сіл. Сённяшні свет патрабуе сведкаў святасці і непарушнасці жыцця кожнага чалавека, асабліва найбольш безабаронных і нявінных дзяцей ва ўлонні маці. У часы глабальнага нападу на сапраўдную прыроду сям'і мы абавязаны актыўна паказваць цуд сакрамэнту сужэнства, якое становіцца калыскай жыцця і падмуркам Дамашняга Касцела.

З табой, Марыя, мы можам супрацьстаяць адчаю і цывілізацыі смерці, якія прыносіць на свет твой супраціўнік. Прыцягні нас, каб мы пагрузіліся ў малітву Ружанца. Прасі разам з намі аб ласцы Божай Міласэрнасці, каб мы з вялікай радасцю і верай усклікалі: «Езу, давяраю Табе!» І вымаўлялі словы Вяночка да Божай Міласэрнасці: «Дзеля Яго балеснай мукі будзь міласэрны да нас і да ўсяго свету!»

Дзякуем Табе, Маці!